**МОЎНЫЯ СРОДКІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КАНЦЭПТУ "РАДЗІМА" Ў ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАХ НІЛА ГІЛЕВІЧА**

***Марозава А.А.,***
*студэнтка 2 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Дзядова А.С., канд. філал. навук, дацэнт

Нацыянальна-культурная адметнасць паэтычных твораў Ніла Гілевіча рэпрэзентуецца праз цэлы шэраг моўных адзінак, якія ў сваёй семантыцы выяўляюць лінгвакультурны феномен канцэпту "Радзіма". Паколькі мастацкія тэксты, у тым ліку і паэтычныя, з'яўляюцца надзейнай крыніцай вывучэння этнакультурнай адметнасці народа, тэма нашага даследавання бачыцца нам дастаткова надзённай і актуальнай.

Мэта артыкула – выявіць і прааналізаваць нацыянальна-культурную спецыфіку моўных сродкаў, праз якія выяўляецца канцэпт "Радзіма" ў паэтычных творах Ніла Гілевіча.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з'яўляюцца выбраныя з паэтычных твораў Н. Гілевіча лексічныя адзінкі, праз семантыку якіх рэпрэзентуецца нацыянальна-культурная адметнасць канцэпту "Радзіма" [1]. Асноўнымі метадамі даследавання выступаюць апісальны метад і метад навуковага назірання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У творчай спадчыне народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча тэма Радзімы з'яўляецца адной з вызначальных. Для аўтара Радзімай з'яўляецца найперш школа, дзе ён вучыўся, мясціны, дзе ён гуляў з сябрамі, родны дом, вёска, гісторыя нашых продкаў…Усё гэта яго Радзіма, яго Беларусь.

У вершы "Ах, якая над Гайнай купальская ноч…" Н. Гілевіч, як сапраўдны майстар слова, выкарыстоўвае цікавыя ў нацыянальна-культурным плане моўныя сродкі, якія выступаюць у якасці рэпрэзентантаў канцэпту "Радзіма": *купальская ноч, кветка-папараць, купальскія агні, купалінка* і інш. Купалле (Купала) – гэта старажытнае земляробчае свята, звязанае з летнім сонцастаяннем і росквітам прыроды ў летнюю пару. Яго адзначаюць ноччу з 6 на7 ліпеня. Купальская ноч, паводле традыцыйных уяўленняў нашых продкаў, звязана з містыкай і дзеяннямі разнастайных міфалагічных істот. У паэтычнай прасторы мастацкага тэксту неаднаразова сустракаецца апісанне абрадаў, звязаных з пошукам ў купальскую ноч папараць-кветкі – гэтай чароўнай і незвычайнай расліны, якая, паводле міфалагічных звестак, магла зрабіць чалавека здаровым, багатым і шчаслівым: *Самы раз бы шукаць кветку-папараць, / Самы раз уплятаць летуцунні ў вянок, / Самы раз белы корань выкапываць!..*

У вершы "Рагнедзе" аўтар шырока карыстаецца эпітэтамі, якія надаюць асобным радкам экспрэсіўную афарбоўку. Напрыклад, *прасветлая княгіня.* Рагнеда – князёўна, дачка вядомага князя Рагвалода – называецца *прасветлай* нездарма. Ніл Гілевіч выкарыстоўвае гэты эпітэт, каб паказаць яе духоўную чысціню: *І аб адным снавала крозу, / І аднаго ў жыцці хацела: / Каб родны край быў вечна вольны, / Не знаў палону, ганьбы рабства; / Каб твой народ, пракляўшы войны, / У мужных сэрцах песціў брацтва.* Звернем увагу на апошні радок. Так, беларусы заўсёды імкнуліся да братняй дружбы з суседнімі народамі і ніколі не распачыналі войны першымі. Эпітэт *мужныя сэрцы* семантызуе такія духоўныя рысы і якасці нашага народа, як мужнасць, вытрымка, адвага.

Трэба адзначыць, што аўтар нярэдка выкарыстоўвае прэцэдэнтныя імёны – імёны найлепшых сыноў Беларусі, тых людзей, якія пакінулі след у яе гісторыі, – Францыска Скарыны, Янкі Купалы і інш. Напрыклад: *У слаўным горадзе Францыска, / Дзе я святкую свята Слова, – / Твае вытокі і калыска, / Твой лёс, пачаты звыш сурова…* ("Рагнедзе"); *Раскладайце агні – хай плывуць па рацэ, / Можа, у зыркім святле іх вы ўгледзіце / Постаць Янкі Купалы з кійком у руцэ – / Запрасіце яго прысуседзіцца!* ("Ах, якая над Гайнай купальская ноч…").

Ніл Гілевіч у роспачы пытаецца ў сваіх землякоў, найперш у моладзі: *Ды ні гуку над Гайнай – пад цёмным шатром. / Толькі зоркі – як вочкі Купаліны. / Дзе ж вы, хлопцы, дзяўчаты? Чаму за сялом, / Над ракою, агні не запалены?* Гэтымі радкамі аўтар падкрэслівае, што нашы сучаснікі пачынаюць забываць свае вытокі, гісторыю беларускага народа, а разам з тым і тое, хто мы ёсць і дзе наша Радзіма. Менавіта таму паэт, як сапраўдны патрыёт і грамадзянін, прыхільнік нацыянальнага адраджэння, у сваім звароце да нашчадкаў просіць не забываць сваю культурную спадчыну, вытокі свайго этнасу, роднай зямлі, што дапаможа беларусам не страціць гістарычную памяць і захаваць нацыянальную ідэнтычнасць: *Раскладайце, паліце Купалля агні! / Не затым, каб ускрэсла мінуўшчына, / А каб лепей убачыць наступныя дні, / Да вытокаў душой дакрануўшыся…*

**Заключэнне.** Такім чынам, даследаваныя моўныя адзінкі, праз якія рэпрэзентуецца канцэпт "Радзіма" ў паэтычных творах Ніла Гілевіча, нясуць у сваёй семантыцы цікавую лінгвакультуралагічную інфармацыю пра беларусаў як самастойны этнас са сваёй унікальнай духоўнай культурай, у тым ліку і традыцыйнай народнай абраднасцю.

1. Гілевіч, Н. Выбраныя творы / Н. Гілевіч. – Мінск: Кнігазбор, 2009. – 600 с.



Рэпазіторый ВДУ